Российская Центральная
Книжная Палата
Зарегистрировано №
тираж

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся.

Савецкая Беларусь

Штодзенная газэта.

Адрэс рэдакцыі й адміністрацыі:
Менск. Петрапаўлаўская № 6
пры Гоўіздаце

Рукапісы мусяць быць напісаны чытэльна і на адным баку паперы. Ня прынятые рукапісы аўтарам не вяртаюцца

ДРУГІ ГОД ВЫДАНЬНЯ

ВЫДАНЬНЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ

№ 219 (329) Нядзеля 2-га кастрычніка 192[illegible]

Сеньня пачынаецца тыдзень дапамогі галадуючым Паволжа. Нясіце магчымую ахвяру! Яе чакае галодны наш брат!

Памагчы трэба даканца.

2 кастрычніка на Беларусі пачынаецца „тыдзень дапамогі галадуючым Паволжа“. На першы погляд людзям, не знаёмым з ходам барацьбы з голадам і асабліва са становішчам у галодных мясцох, можа паказацца дзіўным.

Памагчы Паволжу? Але мы ж толькі і робім, што шлём туды і харчовы падатак і насенную пазыку, якая зьвярта[illegible]ецца назад, і ахвераваньні, якія атрымліваюцца з усіх бакоў? Але гэта толькі на першы погляд здаецца тым, каторыя незнаёмы са становішчам у Паволжы. Іншае ўражаньне атрымліваецца ў тых, каторыя лепей растлумачылі сабе гэта становішча. Гэта ж у Паволжы стала тварам к твару перад голадам ня меней 30 міліёнаў сялян. Гэтыя сяляне кожны год здабывалі шмат міліёнаў хлеба для іншых губерняў. Іх трэба выратаваць і ня толькі іх, але і іх зямлю і іх гаспадарку ад заняпаду, іх дзетак, нашых будучых грамадзян, ад пагібелі.

Задача вялікая і справіцца з ёй можна толькі пры аднадушных патугах і парывах.

Мы два месяцы рабілі дапамогу. Мы выконваем харчовы падатак. Мы шлём эшолоны са збожжам.

Ці досыць жа мы зрабілі? Ці можам жа мы лічыць хоць палову задачы зробленай? Яшчэ не!

Мы да гэтага часу ўсю нашу ўвагу зьвярталі на тое, каб выратаваць край, каб бараць і засеяць зямлю Паволжа. Палі Паволжа дзякуючы нашым патугам з-праўды амаль што засеяны. Але вось палі з людзей—нічога ня варты. Калі ня будзе людзей, каб глядаць за палямі, каб араць хлеб, каб выканаць усе патрэбныя работы, Паволскі край вызваленым ня будзе. Гэта адно. Другое гэта тое, што ратуючы край ад заняпаду, мы самі ахвяроўвалі на самых сябе. Паволскі край нам патрэбен і дужа каштоўны, які каторы нам цераз год-два можа ўсто раз болей вярнуць нашы ахвяры.

Але ж трэба падумаць і аб другіх, аб сялянах, аб нашых братох-працоўніках, ня толькі з тае прычыны, што яны могуць быць нам карыснымі, а проста, што яны нам браты—працоўнікі.

І, калі мы з гэтай стараны падыйдзем да справы, дык мы ўбачым, што намі зроблена яшчэ дужа мала. Кожны дзень прыносе нам новыя енкі і крыкі аб дапамозе з галадуючых месц. Кожны дзень прыносе весткі аб тым, што з расходываньнем астатніх запасаў, новыя тысячы і дзесяткі тысяч сялян паміраюць з голаду.

Ці ж можам мы затыкаць вушы і ня слухаць іх? Ці можам мы заставацца нядбайнымі к гэтым заклікам аб дапамозе з боку галодных і паміраючых? Ці можам мы сытыя запамятаць аб гэтых галодных?

Не! Тысячу разоў не!

Мы пачалі сваю дапамогу горача, шчыра, магутна. Мы за паўтара месяца змаглі выратаваць край ад пагібелі і засеялі яго. Ці ж спынемся мы на гэтым пачатку? Не, мы ня будзем спыняць нашу дапамогу, а яшчэ больш павялічым яе. Мы ня толькі будзем весьці пачатую справу паратунку, але давядзём яе даканца. Мы гэта зробіць можам, бо, па рахунках, 5 грамадзян уродных губерняў могуць лёгка пракарміць аднаго галоднага. І на гэту справу выратаваньня мы павінны пакіраваць усю нашу моц і здольнасьць. Тыдзень дапамогі, які пачынаецца 2 кастрычніка, павінен даць шмат чаго. Першае, ён павінен паказаць, што мы і ў справе вызваленьня галадуючых пойдзем так сама рашуча і ўпарта наперад, як і ў справе выратаваньня палёў Паволжа. Другое, ён павінен даказаць усім ворагам Савецкай улады ўпартае жаданьне прапоўнікаў Савецкіх рэспублік утрымаць здабытыя імі ўладу, зямлю і фабрыкі. Трэцяе, ён павінен паказаць, што ў Савецкай Расеі добра замацавалася новая эпоха ўзаемнай дапамогі, паразуменьня, супрацоўніцтва ўсіх працоўных. А галоўнае, гэты тыдзень павінен зьявіцца першым крокам к зьдзяйсьненьню другой часткі задачы, пастаўленай нам няўродам—выратаваньне ня толькі палёў, але і працаўнікоў над гэтымі палямі—сялян Паволжа. Няхай жа ў гэты тыдзень кожны рабочы, кожны селянін шчыра падумае аб галодных братох і няхай гэта думка і пачуцьцё не пакіне яго да тых часоў, пакуль сяляне Паволжа ня будуць канчаткова выратаваны.

Што чуваць заграніцай.

Чырвоны крыж у Канстантынопалі.

1-га кастрычніка зачыняецца чыннасьць чырвонага крыжа у Канстантынопалі 17 тысяч расейскіх уцекачоў кінуты на галодную сьмерць.

Страшэнная катастрофа.

У Люстгафене (Нямеччына) на хімічнай фабрыцы здарыўся страшэнны ўзрыў грымучага газу. Горад зусім знесены з твару зямлі. Больш 8.000 чалавек загінула.

Непадзельнасьць Верхняй Сілезіі

Варшава, 1. 10. Паф[illegible] Верхняй Сілезіі пасадзі у Савет Лігі Нацыяў [illegible] у якой [illegible] Верхняй Сілезіі [illegible] раўжае [illegible] чым заканад.

Грабіцелі здаровены.

Варшава, 1 10. Аф[illegible] гельскае паведамленьне кажа, што міжсаюзьніцкая кантрольная камісія ўжо здавалена [illegible] бровьня Нямеччыны. У афіцыяль[illegible] саюзьнікаў котах нама [illegible] строну Нямеччына [illegible] Н мецкага войска „[illegible]“, бо Нямеччына [illegible] гэтага патрэбнага [illegible].

Сутычка на Румынскай граніцы.

Варшава 1. 10. (Радыё) Румынскія патрулі каля Капегі пачалі страляць супроць Венгра-румынскай разьмяжовачнай камісіі, якая складаецца з ангельцаў, французаў і японцаў.

Прыёмныя экзамены у Лігу Нацыяў

На апошнім пасяджэньні пленуму Лігі Нацыяў ухвалена прыняць у склад Лігі Нацыяў Эстонію, Латвію, і Літву. Супроць прыняцьця Эстоні і Латві галасавала 35 дэпутатаў, супроць прыняцьця Літвы—38 дэлегатаў. Цікава, што супроць прыняцьця памянёных дзяржаваў у Лігу Нацыяў галасавала Чэхія, Паўдзённая Славія і Польшча, іначай, тыя дзяржавы, якія ва надта даўна знаходзіліся пад нацыянальным ярмом і якім з гэтае прычыны „вольнасьць“ і „самавызначэньне“ павінны быць зразумелымі і дарагімі. Прадстаўнік Персіі Цока-Эд Даулею ўнёс прапанаваньне прыняць у склад Лігі Нацыяў Савецкую Расею.

Гвалты над камуністамі.

РЫГА, 22. 9. Румынская паліцыя ў Бухарэсьце пад [illegible] спробы да пабегу, забіла генеральнага сэкратара прафэсыянальнага саюзу Пасовіча, дэпутата Спірыанава і сэкратара камуністычнай партыі Стэрнберга. Усе забітыя відавейшыя сябры Румынскай камуністычнай партыі

Камуніст у Вэнгерскім парляманце.

У Вэнгерскім парляманце адбылося 25 верасьня вялікае непаразуменьне. У часе разгляду [illegible] праекту зьявіўся [illegible] нацку пачуўся крык: „Няхай жыве камунізм, няхай жыве Савецкая рэспубліка!“ Выявілася, што крычаў былы афіцэр вэнгерскай арміі Рыгор Іонэр, які быў у Савецкай Расеі. Ён быў зараз жа арыштован.

Данцыгскае непаразуменьне

Камісар Антанты ў Данцыгу генэрал Гакінг пастанавіў перадаць усе чыгункі на абшарах Данцыгу Польшчы. Гэта пастанова выклікала рэзкі пратэст большасьці нямецкага жыхарства ў Данцыгу. Данцыгскі сойм паслаў скаргу ў Лігу Нацыяў, якая скасавала пастанову генэрала Гакінга. Напасьледак, дзеле эксплёатацыі Данцыгскіх чыгунак утворана акцыянэрнае таварыства, у якім Польшча мае меншасьць акцыяў.

Нагласьць пабедзіцеляў.

ВАРШАВА. 1-10. Французскае правіцельства паслала Нямеччыне ноту, у якой ад нямецкага правіцельства патрабуецца спыненьня байкоту французскіх тавараў.

1919 году і Севастопаль ле[illegible] 1920 году. Як пры Дэнікі[illegible] пазьней пры Урангелю [illegible] было плаціць за ўсё, нава[illegible] фурманкі, тысячы, так і [illegible] у Варшаве 2 плиткі шакала[illegible] тысяча марак. Абед—тыся[illegible] марак з хвосьцікам. Рыначн[illegible] цэны дужа вялікія і павышаю[illegible] ца кожны дзень. Жыцьцё звычай[illegible] нага грамадзяніна робіцца [illegible] цяжэй і цяжэй. Марка паніжа[illegible] ецца кожную гадзіну і гэта [illegible] рашкаджае чужаземнаму ганд[illegible] спыняе ўнутраныя апэрацы[illegible] заблутвае без таго цяжкае ст[illegible] новішча маладой дзяржавы. І[illegible] які м раць аб заключэньні [illegible] зыкі ў 250 міліёнаў ма[illegible] Амэрыцы. Мары, мары, дзе [illegible] жаданыя вынікі?“.

Арышт афіцэраў у Кракаве

Беларуская газэта „Крыніца“ паведамляе, што ў Кракаве [illegible] дарнэтыя прышмазала [illegible] афіцэраў польскай служ[illegible] абвінаваньню ў бальшавіцкай [illegible] тацыі.

Гвалты над беларускімі настаўнікамі.

Газэта „Крыніца“ друк[illegible] сьпісак 46 беларускіх наста[illegible] нікаў, звольненых палякамі, [illegible] быццам за тое, што яны [illegible] маюць пэдагагічнай падгато[illegible] кі. Запраўды ж гэтыя наста[illegible] нікі ўсе з вышэйшай ці сяр[illegible] няй адукацыяй. Звальнен[illegible] іх ад працы зьяўляецца вы[illegible] камі школьнай палітыкі по[illegible] скай улады, старающайся [illegible] шчыць беларускую культур[illegible] Заходняй Беларусі.

Розныя вест[illegible]

Наша выдавецтва.

„Беларускія ведамасьці“ [illegible] ведамляюць, што: „Сябра Ш[illegible] най Камісіі Камісарыяту [illegible] роднай Асьветы Савецкай [illegible] ларусі Зьмітра Жылуновіч ([illegible] Цішка Гартны) прыехаў [illegible] лін і распачаў вялікае в[illegible] вецтва беларускіх кніг.“

Лёс урангелеўскага войска.

Выспа Лемнос [illegible] ачышчае[illegible] ангельцамі ад урангелеўскага [illegible] ска Лягеры касуюцца. Пер[illegible] з Галіполі скончыцца к к[illegible] верасьня. Коньніца Урангэля [illegible] кіроўваецца ў Сібір, дзе пр[illegible] цельства выкарыстае яе для [illegible] літычных мэтаў, а пехату [illegible] Баўгарыю.

Растрэл Беларускага дзея[illegible]

Газэта „Беларускія веда[illegible] ці“ паведамляе, што на вы[illegible] Лемносе генэрал Куцяпаў р[illegible] раляў беларускага дзяяча [illegible] тана Гарбаненку, прыехаў[illegible] рэгістраваць беларускіх са[illegible] ва ўрангелеўскім вайску.

Нарада беларускіх беспагвардзейцаў.

У Празе склікаецца зьез[illegible] рускіх нацыянальных ар[illegible]

Савецкая Рада і Польшча.

ВАРШАВА. 1.10. (Радыё). Паведамленьні, што тычыцца Пасьля новага абмену [illegible] Савецкім правіцельствам і Польшча [illegible] гчымасьці спыненьня дыпламатычных зносін, ві на чым [illegible] грунтуюцца.

У панскай Польшчы.

Замежная і ўнутраная палітыка Польшчы.

Варшава 1-10. (Радыё). Старшыня польскай рады міністраў Пянюкоўскі сказаў ў сойме вялікую прамову аб замежнай і ўнутранай палітыцы Польшчы. У галіне замежнай палітыкі Пянюкоўскі падкрэсьліў мірныя тэндэнцыі Польшчы. Польшча будзе цьвёрда трымацца выкананьня Рыскай умовы. Польскае правіцельства, прызнаўшае Украіну другой Савецкай Рэспублікай, хутка дасьць выяўленьне гэтага прызнаньня, увайшоўшы з ёй у нармальныя дыплёматычныя зносіны.

Што тычыцца Верхняй Сілезіі і Віленскага пытаньня, дык Пянюкоўскі сказаў: „Што тычыцца Верхняй Сілезіі, дык тут азначэньне пагранічнай лініі будзе залежыць і ад вонкавых [illegible], У зьвязку з пытаньнем аб Вільні правіцельства выказвае самы глыбокі жаль аб вырашэньні Рады Лігі Нацыяў.

Перш, чым выявіць свае адносіны к гэтаму пытаньню, польскае правіцельства абвяшчае, што па яго думцы, за жыхарствам Віленскай вобласьці могуць быць прызнанымі элементарныя правы вырашэньня свайго лёсу.

Падрабязная грашовая праграма хутка будзе дадзена міністрам грашовых спраў Міхальскім. Ужо апрацованы праекты законаў аб надзвычайных падатках і падатках на маемасьць, важныя ў часе вайны.“

Варшава ў нашы дні.

Варшаўскі карэспандэнт „Руля“ так малюе сталіцу Польшчы: „Сёньнешняя [illegible] нагадвае Херсо[illegible]

Буржуйнае самавызначэньне нацыяў

Апошняя імпэрыялістычная вайна паставіла вельмі востра нацыянальнае пытаньне. Перш усяго буржуазея кожнай дзяржавы ўсюды ўласна паведамляе, што яна ваюе толькі ахоўвае сваёй нацыянальнай самасьційнасьці, што ей болей нічога нават і непатрэбна як толькі берагчы на карысьць свайго народу сваю нацыянальную культуру ад нейкіх злачынцаў. Вядома, гэтамі злачынцамі была буржуазея варожых дзяржавіў. У часе вайны нашу нацыянальную незалежнасьць „баранілі“ царская ўлада, але як яна „баранілі“, мы ўсе добра ведаем.

Ды нацыяналізм з беларамуціў гаспадароў працоўных мас так, што яны адушна ўшлі на фронты бараніць сваю нацыянальную культуру ад'яцкай чужой нацыянальнай культуры.

Што ня пытаў, чому ж гэта адна ўлада такая забіяцкая, што хоча ўсіх культуры зьніштожыць? Ніхто ня ўмеў паказаць, што ні ў культуры тут уся справа, а ў тым, што буржуазея кожнай дзяржавы хоча ўтрымаць пад сваю ўладу як ібольш зямлі, багацьця, каб усё большы і большы лік людзей эксплёатаваць і ледзячы на такое глупства, як нейкая там асабістая нацыянальная культура (дзеле чого гр біцель нужнае лічыцца з нацыянальнай культурай?)—таго лічылі здрайцам бацькаўшчыны (ці ж была бацькаўшчына ў працоўнага бедняка?) і адсылалі „да Абрама на піва“.

Скончылася вайна. Буржуазея ніяк ны баранила сваю нацыянальную незалежнасьць ад век вечнага нацыянальнага ворага Нямеччыны. Пачалася нацыянальнае самавызначэньне розных дробных нацыяў. Падпісываюцца Ўмовы Версальскага дагавору. Цяпер, на якое пытаньне ў Ніцшэ, на якое пытаньне ў Версальскага дагавору зварачаюцца? Пытаюся, на чыстае нацыянальнае? Не. Хто так думае, той мягкадушны,—нацыны дурань. Нацыя—нацыя і ўсё. Нацыя якога дабра яна ў мяне... Гэта эйча. А вось Нямеччына ... патрэбна: ад ... Англіі ... Францыі ... Расіі ... Амэрыкі ... Трэба было ... Нацыя — глупства. ... польскай ... нацыя: ... шляхецкай ... нацыя — глупства. ... буржуй ... нацыя — глупства. ... нацыя — глупства. ... нацыя — глупства.